Брыдкае качаня



УДК 821.112.2-93-343.4+821.113.4-93-343.4
ББК 83.84(4Гем)-445+83.84(4Дан)-445
Б89



Серыя «Чытаем самі» заснавана ў 2018 годзе

Мастак: *В. Чайчук*
Пераклад з рускай мовы: *А. Емяльянаў-Шыловіч*
Пераклад ажыццёўлены па выданні
«Гадкий утёнок», Смоленск, Русич, 2018.

Б89 **Брыдкае качаня /** пераклад. з руск. мовы: А. Емяльянаў-Шыловіч. – Мінск : Харвест, 2018. – 48 с.: іл. – (Чытаем самі).

ISBN 978-985-18-4471-1.

УДК 821.112.2-93-343.4+821.113.4-93-343.4
ББК 83.84(4Гем)-445+83.84(4Дан)-445

© Распрацоўка. Афармленне. «Русіч», 2018.
© Пераклад з рускай мовы. Афармленне. ТАА «Харвест», 2018.

ISBN 978-985-18-4471-1



БЛАКІТНАЯ СВЕЧКА

Жыў на свеце салдат. Шмат гадоў ён верай і праўдай служыў свайму каралю, не аднойчы быў паранены на вайне. Але вайна скончылася, і кароль сказаў:

– Можаш ісці дамоў, салдат, ты мне не патрэбны.

Без капейкі ў кішэні служывы пабрыў па дарозе, а пад вечар апынуўся ў лесе. У прыцемках ён убачыў агеньчык і пайшоў на святло. Прыйшоў і бачыць: стаіць на ўзлеску хатка. А ў той хатцы жыла ведзьма.

– Пусці пераночыць і дай вады, – папрасіў салдат.

– Я бабуля добрая і пушчу цябе, але з умовай, што ты мне заўтра ўскапаеш агарод, – адказала старая.

Салдат пагадзіўся. Працаваў ён з самага ранку, але так і не здолеў управіцца да вечара.

– Я так гляджу, давядзецца табе і на гэтую ноч застацца, але ты павінен заўтра нарыхтаваць воз дроў.

Цэлы дзень салдат калоў дровы, а ўвечары ведзьма прапанавала яму застацца яшчэ на адну ноч. Раніцой яна сказала:

– Ёсць за маёй хаткай студня, ураніла я туды надоечы свечку, якая гарыць блакітным полымем і не гасне. Дастань яе.

Старая ўзяла вяроўку, прывязала яе да вялізнага каша, пасадзіла туды салдата і спусціла яго ў студню. Знайшоў салдат свечку, тузануў вяроўку, каб ведзьма цягнула яго назад. Калі салдат быў блізка да краю студні, паспрабавала карга ў яго выхапіць свечку.

Але салдат разгадаў яе ліхі намер і гаворыць:

– Свечку атрымаеш тады, калі я дзвюма нагамі буду стаяць на зямлі.

Ведзьма разлютавалася і адпусціла вяроўку. Салдат упаў на мяккае дно студні. Блакітная свечка гарэла. Але чым яна магла яму дапамагчы? Некаторы час служывы сядзеў нерухома. Потым сунуў руку ў кішэню і намацаў люльку, якая амаль напалову была набітая тытунём. «Мая апошняя ўцеха перад смерцю», – падумаў ён, выцягнуў люльку і прыкурыў ад блакітнай свечкі. Калі студню завалакло дымам, убачыў перад сабой салдат малога чорнага чалавечка.

– Які дасі загад, спадару мой? – звярнуўся ён да салдата.

– А што я магу табе загадаць? – здзівіўся салдат.

– Усё, што захочаш, – адказаў чалавечак.

– Ну, перш-наперш, дапамажы мне выбрацца са студні.

Узяў чалавек салдата за руку і павёў падземным ходам, дзе ведзьма хавала сваё багацце. Салдат набраў столькі золата, што ледзь ногі перастаўляў, а калі выйшлі яны наверх, сказаў чалавечку:

– Цяпер адпраў ведзьму на суд.

Чалавечак знік. Неўзабаве міма салдата са страшнымі енкамі праскакала ведзьма на дзікім каце.

Чалавечак вярнуўся і сказаў:





– Усё зроблена. Ведзьма ўжо на шыбеніцы. Што яшчэ, спадару мой?

– Пакуль мне нічога не трэба, але будзь заўсёды пад рукой.

– Як толькі ты запаліш сваю люльку блакітнай свечкай, я адразу з’яўлюся перад табой, – так прамовіў чорны чалавечак і знік.

Салдат вярнуўся ў горад, дзе служыў раней. Пасяліўся ў самай раскошнай гасцініцы і загадаў метрдатэлю багата абсталяваць яго нумар, заказаў у краўца самы дарагі гарнітур. Калі ўсё было гатова, запаліў салдат люльку, і тут як тут з’явіўся чорны чалавечак.

– Я служыў каралю верай і праўдай, а ён асудзіў мяне на галодную смерць. За гэта я хачу яму адпомсціць, – сказаў салдат.

– Што я мушу зрабіць? – спытаў чалавечак.

– Прынясі сюды ноччу каралеўскую дачку, хай папрацуе ў мяне пакаёўкай.

Роўна апоўначы карузлік прынёс каралеўскую дачку.

– А ну, хутка за работу! – крыкнуў ёй салдат. – Венік у зубы і прыбірайся ў пакоі.

Калі прынцэса скончыла прыбірацца, ён выпрастаў ногі і загадаў:

– Сцягні з мяне боты! Начысці, каб блішчэлі!

Прынцэса выканала ўсё, што ёй загадалі, моўчкі і з прыплюшчанымі вачыма.

На світанні чалавечак занёс яе ў палац. За сняданкам прынцэса расказала бацьку пра дзіўны сон.

– Нехта прынёс мяне ў пакой салдата. Мне давялося прыбіраць яго і чысціць яму боты. Гэта быў сон, але я так стамілася, быццам цэлую ноч працавала.



ЗМЕСТ

Казкі ў перакладзе А. Емяльянава-Шыловіча.
Браты Грым. БЛАКІТНАЯ СВЕЧКА 3
Браты Грым. АДДАНЫЯ ЗВЯРЫ 10
Браты Грым. ЗАЛАТЫ ГУСАК 17
Браты Грым. ДРАЗДАБАРОДЫ КАРОЛЬ 24
Ганс Хрысціян Андэрсан. БРЫДКАЕ КАЧАНЯ 32
Ганс Хрысціян Андэрсан. ЛЁС ДЗЯДОЎНІКА 43

Літаратурна-мастацкае выданне
Серыя «Чытаем самі»

БРЫДКАЕ КАЧАНЯ

ДЛЯ МАЛОДШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Мастак: *В. Чайчук*
Пераклад з рускай мовы: *А. Емяльянаў-Шыловіч*

harvest.minsk.by

6+

Адказная за выпуск: *В.Н. Волкава*

Падпісана да друку 11.05.2018 г.
Фармат 70х90/16. Папера афсетная. Друк афсетны. Умоў.друк.арк. 3.
Ўмоўн.выд.арк. 22,33. Наклад . Замова .

ТАА «Харвест». Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Рэспубліка Беларусь, 220073 г. Мінск, вул. Скрыганава, д. 4А, адм.пам. 39.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 2/102 от 01.04.2014.
Пр.Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.